# АКАДЭМІК АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ І АКАДЭМІІ АГРАРНЫХ НАВУК БЕЛАРУСІ ПЁТР ІВАНАВІЧ АЛЬСМІК

4 красавіка 1992 года на восемдзесят шостым годзе жыцця памёр выдатны вучоны — генетык-селекцыянер, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь, двойчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, Герой Сацыялістычнай Працы, акадэмік ВАСГНІЛ, Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь, Акадэміі аграрных навук Беларусі Пётр Іванавіч Альсмік.



П. І. Альсмік нарадзіўся ў вёсцы Выдрэя Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці. У 1929 г. закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію і пачаў працаваць асістэнтам у аддзеле селекцыі Навазыбкаўскай сельскагаспадарчай доследнай станцыі. З 1931 г. навуковая дзейнасць П. І. Альсміка звязана з селекцыяй бульбы ў Беларусі.

П. І. Альсмік — выдатны вучоны-селекцыянер, шырока вядомы навуковай грамадскасці і вытворчасці ў краінах СНД, заходнееўрапейскіх дзяржавах. Ён быў удастоены ганаровага звання акадэміка Акадэміі сельскагаспадарчых навук былой ГДР. Пётр Іванавіч па праву лічыцца адным з заснавальнікаў навуковай селекцыі бульбы ў Беларусі. У выніку праведзеных фундаментальных тэарэтычных і прыкладных даследаванняў П. І. Альсмік распрацаваў прынцыпова новыя падыходы і метады ў селекцыі бульбы. Ужо ў першай навуковай працы «Крывая росту бульбы», якая выйшла ў 1933 г., ён выклаў метадычныя аспекты выдзялення і адбору скараспелых сартоў бульбы з улікам асаблівасцей росту раслін. У даваенны перыяд селекцыйная работа П. І. Альсміка завяршаецца вывядзеннем і раяніраваннем двух сартоў бульбы.

У гады Вялікай Айчыннай вайны вучоны супрацоўнічаў з партызанамі і ў складаных, а часам і крытычных абставінах здолеў захаваць селекцыйны матэрыял, за што ўзнагароджаны медалём «Партызану Айчыннай вайны» І ступені.

У пасляваенныя гады перад рэспублікай вельмі востра паўстала праблема стварэння ракаўстойлівых сартоў. Навуковы пошук у гэтым напрамку і глыбокае вывучэнне значнага генафонду дазволілі П. І. Альсміку распрацаваць тэарэтычныя асновы селекцыі на ракаўстойлівасць і стварыць шэраг сартоў бульбы, устойлівых да гэтага захворвання: Працоўны, Партызан, Звеннявы, Агранамічны, Зазерскі.

У 1951 г. за вялікія поспехі ў практычнай селекцыі бульбы П. І. Альсміку была прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР.

Выдатным дасягненнем у селекцыі бульбы з'явілася вучэнне П. І. Альсміка аб морфабіялагічных тыпах канстытуцыі раслін бульбы і іх узаемасувязі з прадукцыйнасцю, даўжынёй вегетацыйнага перыяду і ўстойлівасцю да вымірання. Гэтыя распрацоўкі, прадстаўленыя ў 1953 г. у якасці кандыдацкай дысертацыі, прынеслі яе аўтару ступень доктара сельскагаспадарчых навук. Практычным завяршэннем гэтай працы з'явілася стварэнне унікальных па смакавых і іншых гаспадарча-каштоўных прыкметах сартоў — Лошыцкі, Тэмп, Разварысты і інш.

П. І. Альсмік — заснавальнік новага напрамку ў селекцыі бульбы — стварэнні сартоў з высокай колькасцю крухмалу. Распрацаваная ім тэорыя паэтапнай селекцыі з прымяненнем назапашвальных скрыжаванняў дазволіла атрымаць шэраг сартоў з колькасцю крухмалу 22—25, а ў сорту Верба — каля 29—30%.

Шмат сіл і энергіі вучоны аддаваў прапагандзе і ўкараненню дасягненняў навукі ў сельскагаспадарчую вытворчасць. У 1974 г. за работу па вывядзенні, размнажэнні і ўкараненні ў прамысловасць новых высокапрадукцыйных сартоў бульбы П. І. Альсміку і дзесяці яго вучням і калегам была прысвоена Дзяржаўная прэмія СССР.

Да апошняга часу П. І. Альсмік працаваў над вывядзеннем header нематодаўстойлівых сартоў бульбы сталовага і тэхнічнага прызначэння. Раяніраваны ў 1989 г. нематодаўстойлівы сорт Беларуская 3 за кароткі тэрмін атрымаў шырокае распаўсюджанне ў рэспубліцы і за яе межамі. За ўвесь перыяд навуковай дзейнасці было раяніравана 18 сартоў вучонага.

П. І. Альсмік — аўтар больш за 100 навуковых прац. Сярод іх фундаментальная манаграфія «Селекцыя бульбы ў Беларусі», за якую аўтару прысуджаны залаты медаль імя І. У. Мічурына.

П. І. Альсмікам створана вялікая навуковая школа селекцыянераў. Пад яго кіраўніцтвам абаронена 16 кандыдацкіх дысертацый. За плённую навуковую дзейнасць у галіне селекцыі П. І. Альсміку прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы з уручэннем ордэна Леніна і залатога медаля «Серп і Молат». Ён двойчы ўдастоены звання лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР, званняў «Заслужаны дзеяч навукі БССР» і «Лепшы вынаходнік сельскай гаспадаркі СССР», узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Айчыннай вайны II ступені, Дружбы народаў, трыма ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, многімі медалямі, дыпломамі і граматамі.

Светлая памяць пра Пятра Іванавіча Альсміка захаваецца ў сэрцах яго вучняў, паплечнікаў, супрацоўнікаў — усіх, каму выпала шчасце працаваць побач з ім.

*В. С. АНТАНЮК, А. Ф. БАГДАНОЎСКІ, С. Г. СКАРАПАНАЎ, М. М. СЕВЯРНЁЎ*